УДК 821.161.3-3.09(045)

**Бурдзялёва Ірына Аляксееўна**
Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт
(г. Мінск, Беларусь)
Irlita@yandex.ru

# АБ СУПЯРЭЧЛІВАСЦІ ВЕДАЎ У ПРОЗЕ ЯНА БАРШЧЭЎСКАГА І ЛЮДМІЛЫ РУБЛЕЎСКАЙ

У артыкуле разглядаецца характэрны для рамантызму матыў небяспечных і забароненых ведаў, якія вядуць да духоўнай і фізічнай гібелі. Адзначаецца ўвага пісьменнікаў да маральна-этычнага складніку ў працэсе пазнання.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***Ключавыя словы:*** небяспечныя веды, рацыянальнае і духоўнае, дэгуманізацыя, маральная адказнасць

The article examines the distinctive Romantic motif of dangerous and forbidden knowledge that leads to physical and spiritual death. The authors paid a lot of attention to the moral and ethical component in the perception process.

***Keywords:*** dangerous knowledge, rational and spiritual, dehumanization, moral responsibility

Імклівае развіццё навукі і небяспечных тэхналогій прымушае задумацца аб неабходнасці маральнага кампанента, які павінен быць вызначальным у авалоданні таямніцамі навакольнага свету. Мастацкая літаратура заўсёды спраўна выконвала прагнастычную функцыю, ролю сацыяльнага прадбачання і папярэджвала пра небяспеку рацыяналістычнага мыслення, надзвычай балюча рэагуючы на працэс дэгуманізацыі грамадства. XIX стагоддзе ў эйфарыі ад уласных поспехаў у пазнанні і пераўтварэнні свету нарадзіла паняцце "навукова-тэхнічны прагрэс", але мастацкая літаратура ў процівагу ўсеагульнай самаўпэўненасці і захапленню асцярожна ўзважвала плюсы і мінусы на шляху гэтага прагрэсу, разважала пра кошт, які чалавек мусіць заплаціць за ўсё больш актыўнае ўмяшальніцтва ў прыроду, нястомна падымала праблему маральнасці ведаў і адказнасці навукі перад будучыняй. Асаблівы скепсіс адносна навуковых памкненняў выказвалі пісьменнікі-рамантыкі.

Супярэчлівае стаўленне да кніжных ведаў і страх перад ведай тайнай, забароненай праходзіць праз зборнікі навел Яна Баршчэўскага "Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях" і "Драўляны дзядок і кабета Інсекта". Галоўныя героі кніг, пан Завальня і пан Зямельскі, – патрыярхальныя шляхціцы і кансерватары, але іх кансерватызм прасякнуты гуманістычным пафасам. У творах пісьменніка хрысціянскае і старасвецкае – сінанімічныя паняцці, антаганістычныя агрэсіўнаму ў сваім рацыяналізме новаму часу. У навелах Я. Баршчэўскі неаднаразова паказвае, што навукова-тэхнічнае развіццё цягне за сабой немінучы разрыў з традыцыямі, у аснове якіх ляжыць напрацаваны вопыт пакаленняў як эмпірычны, так і духоўны, таму прагрэс бачыцца яму разрывам з сфарміраванай у часе сістэмай маральна-этычных каштоўнасцяў і нацыянальнай самабытнасцю. Станоўчы, пазітыўны характар кансерватызму патрыярхальных герояў Я. Баршчэўскага бачыцца не толькі ў захаванні духоўных асноў, старадаўніх звычаяў, але і ў абароне таго, што можна пазначыць як этнакультурную аснову Беларусі.

Як трапна заўважыў П.В. Васючэнка, "Каляндар – адзіная кніга, пасля "Біблії", якую прызнае і чытае шляхціц Завальня. У "Біблії" ён, як і крывіч Скарына, знаходзіць амаль усё, што патрэбна для душы і розуму. Усю астатнюю мудрасць – гаспадарчыя парады, назіранні за прыродай і колькі займальных гісторый – змяшчае ў сябе "Каляндар". Гэта – той мінімум тэксту, які патрэбен чалавеку аўтэнтычнаму, які жыве ў згодзе з Богам, прыродай і людскімі законамі…" [2, с. 27]. На аповеды пляменніка Янкі, выпускніка Полацкай



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

езуіцкай акадэміі, з антычнай міфалогіі, “Адысеі” ды “Энеіды”, пан Завальня рэагуе без асаблівай цікавасці: “І такому вас вучаць езуіты ў школах, навошта ж гэта прыдасца?” [1, с. 21]

У многіх навелах Я. Баршчэўскага ўвасоблены матыў небяспечнасці кніжных ведаў або ўяўнай вучонасці, бо яны нараджаюць ілюзію ўсёведання, усемагутнасці, непамерную самаўпэўненасць, якая рана ці позна прыводзіць да самаразбурэння чалавека, як гэта прадэманстравана аўтарам у навеле “Горды філосаф”. Герой твора хваліўся чытаннем антырэлігійных кніг французскіх аўтараў, здзіўляў суседзяў сваёй адукаванасцю, моладзь цягнулася да яго, “каб паслухаць пра высокія матэрыі… Ён апавядаў пра цуды, тлумачыў таямніцы прыроды, якіх сам не разумеў.” І хаця старыя людзі папярэджвалі, што няма праўды, вышэйшай за веру, а чалавечы розум павінен супакоіцца, бо божыя цуды за мяжой разумення, – герой у сваім уяўным усяведанні заганарыўся. Мізэрнасць чалавека, марнасць яго ведаў і бездапаможнасць розуму перад абліччам Бога і вечнасці паказваюцца пісьменнікам з дапамогай сімвалічных метамарфозаў Філосафа. На вачах у людзей яго мудрая галава раптам пераўтварылася ў маленькі шарык, падобны да макавай галоўкі. У касцёле, куды ён выпадкова патрапіў, дужы Філосаф змяншаецца ў памерах і становіцца роўным з дзіцячую драўляную лялькy. Перасцярога аўтара відавочная: натура, у тым ліку і духоўная натура чалавека, не церпіць пустаты. Адкідаючы духоўныя прыярытэты, высмейваючы маральныя законы, Філосаф прыцягвае цёмныя сілы і канец яго сумны. Яго пачынаюць праследаваць прывіды і іншыя жахі, і ўрэшце ён, знерваваны, паміpae ад страху, калі на сцяне раптам пераламілася асада з партрэтам дзеда-нябожчыка.

Я. Баршчэўскі стварае цэлы шэраг сітуацый, якія папярэджваюць чытача аб небяспецы залішняй цікаўнасці і імкненняў зведаць тую сферу іншабыту, якую чалавек не ў стане спасцігнуць і тым больш кіраваць ёю. Аўтар неаднаразова падкрэслівае: не лезь безаглядна туды, чаго не ведаеш, бо невядома, чым гэта скончыцца. Адзін з герояў кнігі ”Шляхціц Завальня” Адольф, апантаны прагай дазнацца будучыні, з дапамогай жабер-травы адпраўляецца ў падарожжа па часе. Паказальна, што з гэтай вандроўкі ён так і не вярнуўся. Невыпадкова гэта адзіны сюжэт, які мае ў кнізе адкрытую канцоўку: аповед пра Адольфа перапыняецца прыездам чарговага госця, і гэта гісторыя застаецца няскончанай.

Матыў небяспечных ведаў цесна звязаны ў творах Баршчэўскага з чарнакніжніцтвам. Кароткае знаёмства школяра Гугона з тэкстам старажытнай кнігі, знойдзенай у пакоі містычнага чараўніка пана Твардоўскага, прыводзіць школяра да смерці, а ў яго мёртвае цела засяляецца злы дух. Вобраз Чарнакніжніка з’яўляецца скразным для твораў Баршчэўскага. Ён адначасова носьбіт таемных, забароненых ведаў і ўвасабленне непераможнага зла. Сярод шматлікіх міфалагічных істот, якія багата насяляюць творы Баршчэўскага, яго вылучае тая акалічнасць, што “чарнакніжніцтва – з’ява цывілізацыйная, а не



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

міфалагічная" [2, с. 34]. Чарнакніжніцтва народжана рацыяналізмам, паклікана да жыцця задавальненнем жаданняў прагматычных і эгаістычных, у першую чаргу прагай багацця і ўлады. У навелах Баршчэўскага нават ненаўмысны саюз з Чарнакніжнікам прыводзіць да таго, што героі становяцца паслухмянай цацкай у руках цёмных сіл. Шляхта верыць Чарнакніжніку як вучонаму чалавеку, а веру і традыцыі народа трымае за неадукаванасць і цемрашальства, але у выніку горка расплачваецца за свае памылкі. Так, у навеле "Валасы, якія крычаць на галаве" Чарнакніжнік пры сустрэчы з панам Генрыкам прэзентуе сябе вучоным чалавекам, які "дазнаўся пра самыя пакрыёмыя таямніцы прыроды", змагаром з людскімі забабонамі і невуцтвам. Паступова Чарнакніжнік бярэ ўладу над Генрыкам, прыкрываючы барацьбу супраць традыцыйных каштоўнасцей размовамі пра практычныя выгоды: "Пакінь сумнявацца. Ты чалавек – і ўсё павінна служыць табе" [1, с. 213]. Атрута глыбока пранікае ў душу Генрыка – паступова знікае каханне да жонкі, спагада да сялян, нараджаецца чэрствасць, жорсткасць, адчуванне ўседазволенасці.

У творах Я. Баршчэўскага навуковыя веды супрацьпастаўляюцца духоўным набыткам і аказваюцца варожымі, небяспечнымі, разбуральнымі для чалавека і яго натуральнага атачэння. Пісьменнік адмаўляе як кніжную схаластыку, так і рацыяналізм мыслення, але пры гэтым прызнае і шануе практычныя веды земляроба, якія дазваляюць жыць у гармоніі з прыродай, не парушаючы яе законаў. Скептычнае стаўленне да прагрэсу вынікае ад страху перад дэгуманізацыяй чалавека, занядбаннем і разбурэннем яго боскай сутнасці.

Адносіны да навуковага пазнання былі цесна звязаны ў гісторыі культуры з канцэпцыяй чалавека і свету і, натуральна, у сваім асэнсаванні мелі розныя акцэнты. Праблемы дапытлівасці чалавечага розуму і разам з тым пытанні небяспечнасці ведаў прысутнічаюць у пенталогіі сучаснай пісьменніцы Л. Рублеўскай пра прыгоды Пранціша Вырвіча. Раманы пераносяць чытача ў другую палову XVIII стагоддзя, у перыяд апошніх часоў існавання Рэчы Паспалітай як самастойнай дзяржавы. Сама аўтарка вызначае жанр сваіх кніг як «раманы прыгодніцкія і фантасмагарычныя». Нечаканыя дынамічныя сюжэтныя павароты, добра зманціраваныя паміж сабой прыгоды, якія часта вырашаюцца прыёмам deus ex machina, любоўныя перапетыі трымаюць чытача ў пастаянным напружанні, робяць твор кінематаграфічным, падобным на прыгоды д'Артаньяна і яго сяброў-мушкецёраў, на славутыя прыгодніцкія серыялы пра Індыяну Джонса. Некаторыя крытыкі ўбачылі ў творах Л. Рублеўскай эстэтыку рамана "плашча і шпагі", але хутчэй пенталогія вытрымана ў рэчышчы яго адгалінавання, прыгодніцкай літаратуры нацыянальнага рамантызму – рамана "кунтуша і шаблі".

Гістарычныя творы Л. Рублеўскай некаторыя беларускія крытыкі пахвальна называюць "меладраматычнымі інтэрпрэтацыямі" мастацкіх ідэй У Караткевіча, гавораць пра ўспадчынены гістарычны рамантызм пісьменніцы. Разам з тым Л. Рублеўская – аўтарка постмадэрнісцкай эпохі, і хаця перад намі твор, які сцвярджае традыцыйныя каштоўнасці і ідэйна супрацьстаіць



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

постмадэрнізму, пісьменніца творча выкарыстоўвае постмадэрнісцкія прыёмы цытавання, калажу, літаратурнай гульні. Яе твор насычаны перазовамі з творамі А. Міцкевіча, Я. Баршчэўскага, Я. Купалы, У Караткевіча, якія ў сваю чаргу генетычна звязаныя паміж сабой.

Нягледзячы на куртуазнасць і авантурнасць, раманы пісьменніцы ўздымаюць шэраг важных пытанняў, маюць значную выхаваўчую каштоўнасць. Пенталогія Л. Рублеўскай вызначаецца сваім беларусацэнтрызмам. Нягледзячы на тое, што сюжэт пераносіць чытача ў часы Рэчы Паспалітай, у якой назва Беларусь была на маргінэзе, героі раманаў Пранціш Вырвіч і Баўтрамей Лёднік самаўсведамляюць сябе менавіта ліцвінамі-беларусамі. Гэты нацыяцэнтрызм выяўляецца і ва ўзнаўленні гісторыі нашага краю, і ў тым, што асноўнае дзеянне кніг адбываецца на беларускай зямлі, але перадусім гэта бачна ў сістэме каштоўнасцяў, якія аўтарка раз за разам прыгадвае і адстойвае словамі і ўчынкамі сваіх герояў. Яе творы ў лепшых традыцыях беларускай адраджэнскай літаратуры нацыянальна-будзіцельскія, скіраваныя на ўмацаванне нацыянальнай годнасці. Праз усе кнігі праходзіць матыў чалавечага гонару і высакароднасці, якія героі мусяць пастаянна адстойваць з дапамогай шаблі. У сітуацыі палітычных авантур, хаосу і бязладдзя героі пазначаны пачуццём адказнасці за сябра, за каханую жанчыну, урэшце, за спаўненне прысягі, дадзенага абяцання, для іх словы "вернасць" і самаахвярнасць" не пусты гук. Калі схема "гаспадар-раб" у тандэме Вырвіча і Лёдніка разбураецца, то старэйшы і мудрэйшы Лёднік, разумеючы, што эмацыянальны і няўрымслівы Вырвіч патрабуе апекі і кіраўніцтва, не пакідае яго. Больш таго, як дзве крайнасці характару, яны адчуваюць глыбокую патрэбу адзін у адным. Героі маюць гаваркія прозвішчы: тэмпераментны, парывісты Вырвіч і стрыманы, іранічны Лёднік. Варта адзначыць, што Лёдніка пісьменніца зрабіла сапраўдным супергероем, спалучыўшы ў яго постаці вялікі розум, звышмагчымасці, знешнюю стрыманасць і дасканалыя баявыя здольнасці. Калі Пранціш Вырвіч, малады ганарысты шляхціц, выхаваны ў духу рыцарска-сармацкага кодэксу, то Баўтрамей Лёднік – прадстаўнік Новага часу, чалавек Асветніцтва, які змагаецца з цемрашальствам і забабонамі, робіцца паплечнікам славутага А. Тызенгаўза, сябрам магутнай Адукацыйнай камісіі.

Менавіта з Баўтрымам Лёднікам звязаны матыў небяспечных, цёмных ведаў. Лёднік – чалавек вялікай адукаванасці, якую ён атрымаў найперш ва ўніверсітэтах Прагі і Ляйпцыга, няспынны шукальнік і захавальнік каштоўных таемных ведаў, ад якіх тым не менш здолеў добраахвотна адмовіўся. У мінулым Лёднік астролаг і алхімік, ён дзесяць гадоў аддаў таемным навукам, небяспечным эксперыментам, вынаходніцтву алхімічнага золата. За сваю залішнюю цікаўнасць і амбітнасць Лёднік заплаціў вялікую цану: ледзь не забыўся пра каханую, адмовіўся ад лекарскай практыкі, страціў маёмасць і трапіў у рабства. За адмову і далей займацца алхіміяй, астралогіяй і іншымі сумнеўнымі справамі, яго былы гаспадар, як непатрэбную рэч, прадае чарнакніжніка за шэлег першаму сустрэчнаму, то бок Пранцішу Вырвічу. Залішняя цікаўнасць абодвух герояў



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

становіцца частай прычынай іх неспакойнага жыцця і цягне за сабой цэлы ланцуг непрадказальных прыгод. Так далучанасць да таемных ведаў з'яўляецца сюжэтаўтваральным прыёмам другой часткі трылогіі, калі Лёднік з Вырвічам вырашаюць адчыніць скрыню з красамоўнай назвай "Пандора", і гэта становіцца пачаткам нягод не толькі для іх саміх: як высвятляецца потым, таямніца, якую захоўвае схаваная ў скрыні механічная лялька Пандора, можа прынесці шмат бед чалавецтву. Зразумела, што лялька Пандора сімвалізуе тыя небяспечныя веды, з якімі цікаўнаму чалавецтву лепш не судакранацца.

У раманах Лёднік неаднаразова называецца полацкім Фаўстам, а таксама праводзіцца паралель з славутым алхімікам панам Твардоўскім. Адрозненне ад гэтых легендарных постацяў у тым, што Лёднік здолеў у час усвядоміць тую мяжу ў прасоўванні чалавечага розуму ў небяспечныя сферы ведаў, перад якой ратуючы душу варта спыніцца: "Так, я ўсё мог аддаць за новыя веды… Акрым душы… І мне страшна ўявіць, як далёка я мог бы зайсці па дарозе ў бездань… Але ўсё ў волі Госпада, я зразумеў, што браць на сябе ролю абранца і носьбіта таемных ведаў – найвышэйшая праява гардыні" [3, с. 27]. Лёднік не раз прыносіць сваё пакаянне, што дакрануўся да свету такіх таямніц, дзе знікаюць паняцці гуманнасці, сумленнасці, маральнасці: "Якое шчасце, што Гасподзь у час мяне спыніў, не даў дайсці да бездані… Цікаўнасць пераважала ўсё… Нават боязь загінуць духоўна" [4, с. 24]. Цёмныя навукі, небяспечныя веды з'яўляюцца добрым выпрабаваннем духоўнай сталасці Лёдніка, трываласці яго маральнага імператыву, таму што час ад часу яны спакушаюць героя адчуваннем неверагодных магчымасцяў: "Вы проста не разумееце, як гэта вабіць… Усе гэтыя таемныя навукі… Як гэта хвалюе, круціць галаву – новыя веды, новыя адкрыцці, недаступныя "звычайнаму" чалавеку… Гэта сатанінская амарока дужа моцная – наконт усемагутнасці. Разумееш, што гэта амарока, толькі калі пачынаеш гінуць" [4, с. 67]. Такое ўсведамленне небяспечных ведаў, павага да боскага, шанаванне святынь, да якіх канфесій яны бы ні адносіліся, выдае Лёдніка як шчырага верніка, узвышае яго, абумоўлівае маральна-этычны кампанент у ягоных далейшых навуковых пошуках, пачуццё адказнасці за веды, за найноўшыя навуковыя адкрыцці. Калі з'яўляецца спакуслівая магчымасць адшукаць сакрэт даўняга навуковага вынаходніцтва, якое можа пераўтварыцца ў небяспечную зброю і справакаваць вайну, то Лёднік адразу адчувае небяспечную мяжу: "Што з гэтага будзе?..Твая цікаўнасць вартая такога, Фауст?" [4, с. 67].

Час падзей у раманах Л. Рублеўскай – пярэдадзень і самы пачатак эпохі Асветніцтва, калі ўзмацняюцца працэсы секулярызацыі, чалавек вызваляецца ад рэлігійнага кантролю, адчувае прагу ведаў і моц свайго розуму. Як захаваць няўлоўны баланс паміж ведай карыснай і небяспечнай, паміж здаровым традыцыяналізмам і навуковай эвалюцыяй, рацыяналістычным і духоўным? Як застацца чалавекам Божым у няспынным прагматычным імкненні спасціжэння новых ведаў? Абодва пісьменнікі, падзеленыя паміж сабой стагоддзямі, сыход-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

зяцца ў адным: без захавання духоўнага складніку, без усведамлення адказнасці за атрыманыя веды чалавецтва асуджана на самазнішчэнне.

## Літаратура


1. Баршчэўскі, Я. Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях / Я. Баршчэўскі ; уклад., пер. з пол. мовы і камент. М. Хаўстовіча. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1990. – 383 с.
2. Васючэнка, П. В. Адлюстраванні першатвора / П. В. Васючэнка. – Мінск : І. П. Логвінаў, 2004. – 144 с.
3. Рублеўская, Л. Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега / Л. Рублеўская. – Мінск : Выдавецкі дом "Звязда", 2012. – 325 с.
4. Рублеўская, Л. Авантуры студыёзуса Вырвіча / Л. Рублеўская. – Мінск : Выдавецкі дом "Звязда", 2014. – 320 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова